УДК 811

І.А. Блізнюк, ст. выкл.
(Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь, г. Мінск)

# ВЫВУЧЭННЕ ВАЕННА-ПРАФЕСІЙНАЙ ЛЕКСІКІ І ТЭРМІНАЛОГІІ Ў КАНТЭКСЦЕ ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ КУРСАНТАЎ

Кожны год у нашай краіне праходзіць пад асобым знакам. Год 2023 аб'яўлены Годам міру і стварэння, адным з ключавых напрамкаў якога будзе «ўдасканаленне сістэмы ваенна-патрыятычнага выхавання насельніцтва» [1].

Адным з лепшых дасягненняў мінулага з'яўляецца выпрацаваны стагоддзямі кодэкс маральнасці ў арміі, адвечнымі каштоўнасцямі якога з'яўляюцца патрыятызм, гонар, годнасць, воінскі абавязак салдат і афіцэраў. Многія палкаводцы і военачальнікі, відныя мысліцелі і грамадскія дзеячы розных часоў добра разумелі значэнне маральнага элементу ў абучэнні і выхаванні воінаў, адводзячы патрыятызму галоўную ролю.

Сам тэрмін «патрыятызм» параўнальна малады. Ён прыйшоў да нас у XVIII стагоддзі разам з іншымі лексічнымі запазычаннямі («патрыятызм» ад грэч. patris – «айчына»). У той час яно трактавалася як «айчыны сын», але аналагі паняцця існавалі і раней. Да прыкладу, у грэкаў сустракалася слова «филополис», якое абазначала «той, хто любіць свой горад». На Русі можна было пачуць слова «отечестволюбец» [2].

У сучасным разуменні патрыятызм трактуецца як асэнсаваная любоў да Радзімы, адданасць, імкненне і гатоўнасць сваімі дзеяннямі, учынкамі служыць яе інтарэсам. Патрыятызм – гэта любоў да свайго народа, павага да яго гісторыі, традыцый, захаванне дасягненняў культурнай спадчыны і каштоўнасцей сваёй краіны, роднай мовы.

У працэсе выкладання дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» у Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь заўсёды надавалася вялікая ўвага патрыятычнаму выхаванню будучых ваенных спецыялістаў, а з улікам новых рэалій і патрабаванняў часу гэты напрамак набывае асаблівае значэнне і актуальнасць.

Мэта артыкула – на прыкладзе вывучэння раздзела «Лексічная сістэма беларускай мовы» раскрыць адзін з важных метадычных прынцыпаў – прынцып адзінства навучання і выхавання, які забяспечвае фарміраванне ў курсантаў якасцей, неабходных для прафесійнай дзейнасці, і, несумненна, стварае глыбокую матывацыю вывучэння роднай мовы.

Выключная важнасць дысцыпліны закладзена ўжо непасрэдна ў самім яе змесце: увесь лінгвістычны, у тым ліку і лексічны матэрыял вывучаецца на аснове тэкстаў ваеннай тэматыкі, прафесійнай накіраванасці і патрыятычнага зместу, асноватворнымі паняццямі якіх з'яўляюцца любоў да Радзімы, вернасць воінскаму абавязку, воінскі гонар, храбрасць, стойкасць, самаахвярнасць, доблесць, мужнасць, адвага і да т.п.

Аснову раздзела складаюць тэмы «Лексіка беларускай мовы паводле яе выкарыстання ў ваенна-прафесійнай дзейнасці», «Спецыяльная лексіка», «Ваенная фразеалогія», «Этымалогія ваенных тэрмінаў і фразеалагізмаў» і інш. [3, с. 50-85].

Тэарэтычнае вывучэнне тэм традыцыйна пачынаецца з агульнай характарыстыкі лексікі беларускай мовы і мае на мэце пашырэнне і ўдасканаленне ведаў, атрыманых у школе, павышэнне агульнаадукацыйнага ўзроўню, развіццё кругагляду курсантаў з наступным іх выхадам у актыўнае вуснае і пісьмовае маўленне.

Заданні і практыкаванні таксама традыцыйныя:

на асновеназіранняў табліцы падзелу лексікі на разрады адказаць на пытанні (напрыклад, *якое месца ў лексічным складзе беларускай мовы займае спецыяльная ваенная лексіка? Абгрунтуйце свой адказ*);

знайсці ва ўрыўку з мастацкага твора словы, якія адносяцца да ваеннай лексікі (напрыклад, *акоп, бліндаж, шынель, камандзір, кулямет*);

вызначыць словы па лексічным значэнні, скласці з імі сказы, кароткі звязны тэкст;

запісаць па-беларуску тэрміналагічныя адзінкі (напрыклад, *манёвр, обороноспособность, артиллерия*);

расшыфраваць ваенныя і агульнавядомыя абрэвіятуры (*СПА, ЗРК, МУС, АМАП, РЭБ і інш*).

На гэтым этапе адной з першых апорных тэм для ўвядзення новай лексікі і развіцця маўлення з'яўляецца тэма «Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь», якая ўключае шматлікія вусныя і пісьмовыя заданні і практыкаванні. Тут курсанты знаёмяцца з паходжаннем назвы сваёй навучальнай установы (тэкст «Акадэмія»), з гісторыяй фарміравання («Старонкі гісторыі. Ваенная акадэмія»), з яе некаторымі падраздзяленнямі («У акадэмічнай бібліятэцы», «Мой факультэт») і інш. Слоўнікавы запас папаўняецца назвамі факультэтаў, кафедраў, словамі, якія адносяцца да вучэбнага працэсу, заняткаў, відаў вучэбнай дзейнасці. Для засваення лексікі выкарыстоўваецца метад гутаркі.

Для пашырэння агульнага кругагляду курсантаў прапануюцца матэрыялы з рубрыкі «Гэта цікава ведаць». Напрыклад, праца над тэмай «Пятроўскія рэформы» (пра асаблівасці падрыхтоўкі афіцэраў пры Пятру I) закладвае асновы павагі і гонару да сваёй вучэбнай установы, павышае матывацыю атрымання прафесіі ваеннаслужачага.

Па меры ўскладнення тэарэтычнага матэрыялу ўскладняюцца заданні, формы і метады працы, якія маюць на мэце не толькі засваенне большай колькасці тэрміналагічных адзінак, але і актыўны выхад у камунікацыю.

Сістэма працы па засваенні спецыяльнай лексікі пачынаецца з азначэння паняццяў «тэрміналогія», «прафесіяналізмы», «наменклатура». Затым выконваюцца заданні па іх вызначэнні ў тэкстах, разглядаюцца асаблівасці словаўтварэння беларускай ваеннай тэрміналогіі, праводзіцца экскурс ў гісторыю яе ўзнікнення і фарміравання. Лексічны практыкум узбагачае слоўнікавы запас курсантаў групамі слоў, якія адносяцца да органаў ваеннага кіравання, чыноў, пасад, воінскіх званняў, вайсковых злучэнняў і падраздзяленняў, родаў і відаў войскаў.

Сярод практыкаванняў можна вылучыць такія, якія развіваюць мысленне, маўленне, напрыклад:

назваць тэрміны, што адносяцца толькі да ваеннай лексікі (*лайнер, крэйсер, камандзір, ад'ютант, ад'юнкт і інш.*);

раскрыць значэнне тэрмінаў, скласці з імі сказы;

прывесці прыклады, дзе маглі сутракацца з гэтымі словамі, ахарактарызаваць сітуацыю.

Варта адзначыць, што нават вакол аднаго слова можна выкарыстаць разнастайныя формы навучання. Спачатку тлумачыцца значэнне гэтага слова-тэрміна, напрыклад, «ад'ютант – афіцэр, які стаіць пры вышэйшым ваенным начальніку для выканання службовых даручэнняў ці штабной работы». Далей курсантам прапануецца адказаць на пытанні, якія патрабуюць разважанняў, увядзення новых лексічных адзінак і ваенных тэрмінаў:

Якія вышэйшыя ваенныя званні і пасады вы ведаеце?

Хто ведае паходжанне гэтага слова?

Якія мастацкія творы вам вядомы, дзе адным з герояў з'яўляецца ад'ютант? Хто аўтар?

Калі вы глядзелі мастацкі фільм «Адъютант его превосходительства», то раскажыце пра свае ўражанні і г. д.

Лепшым узорам матэрыялаў вучэбна-выхаваўчага плана і пазнавальнага характару з'яўляюцца лексічныя тэмы прафесійнай накіраванасці і патрыятычнага зместу, аб'яднаныя ў тэматычны блок

«Аб патрыятызме, гонары і годнасці» («Старонкі воінскай славы беларускага народа», «Сімвалы воінскай доблесці, славы і гонару», «Твае, Радзіма, героі» і інш.) [3, с. 231-256].

Формы і метады працы над тэмамі самыя разнастайныя і цесна звязаны з характарам і зместам фактычнага матэрыялу: праца над словам, развіццё актыўнага маўлення, выклад сваіх думак, меркаванняў, уражанняў у форме звязнага тэксту, эсэ, сачынення, абмеркаванне герояў мастацкіх твораў і кінастужак і інш. Яны даюць магчымасці найлепшым чынам, паслядоўна і мэтанакіравана рэалізаваць пастаўленыя задачы адукацыйнага і выхаваўчага характару.

Выконваючы асноўную функцыю – узбагачэнне слоўнікавага запасу і развіццё маўленчых навыкаў – лексічныя тэмы ўводзяць курсантаў у спецыяльнасць, раскрываюць спецыфіку прафесіі вайскоўца, выхоўваюць павагу да айчыннай гісторыіі, абуджаюць цікавасць да лепшых ваенных традыцый, выхоўваюць патрыятычныя пачуцці і высокія маральныя якасці.

ЛІТАРАТУРА

1. 2023 год аб'яўлены Годам міру і стварэння: https://president.gov.by/be/events/2023-god-ab-yauleny-godam-miru-i-stvarennya (дата звароту: 11.01.2023).

2. Что такое патриотизм простыми словами, его положительные и негативнины проявления: https://iklife.ru/samorazvitie/chto-takoe-patriotizm (дата звароту: 11.01.2023).

3. Беларуская мова. Прафесійная ваенная лексіка: вучэб. дапам. для курсантаў і слухачоў устаноў вышэйшай адукацыі па ваенных спецыяльнасцях / Т.І. Блізнюк, І.А. Блізнюк. – Выд. 2-е, дап. – Мінск: ВА РБ, 2013. – 300с.

УДК: 811.161.3’367’04

С.М. Макітрук, навук. супр.
(ЦДБКМіЛ НАН Беларусі, г. Мінск)

## ДАДАНЫЯ ПАРАЎНАЛЬНЫЯ Ў ТЭКСТАХ СТАРАБЕЛАРУСКАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ

У апошнія гады заканамернай з’яўляецца цікавасць да вывучэння складаназалежнага сказа, бо ён адносіцца да ліку тых граматычных катэгорый, якія на працягу гістарычнага перыяду існавання ўсходнеславянскіх моў зазналі істотныя змены. “Сінтаксічныя канструкцыі, якія выражаюць параўнанне, як адну з